

# ГРОДЗЕНСКІ УНІВЕРСІТЭТ

ГАЗЕТА КАЛЕКТЫВУ ГРОДЗЕНСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ Я. КУПАЛЫ

№ 14 (169) 7 мая ... года


## У СЭРЦАХ НАШЫХ ЖЫВЕ ПЕРАМОГА

9 мая — свята Вялікай Перамогі. Гэты дзень паклаў канец адной з самых жудасных і бесчалавечных трагедый у гісторыі чалавецтва — вайне, развязанай фашызмам супраць Савецкага Саюза, адзінай у той час сацыялістычнай краіны. Для савецкага народа гэта было адно з найвялікшых і найцяжэйшых выпрабаванняў. У гэтай вайне вырашыўся не толькі лёс СССР, але і будучыня сусветнай цывілізацыі, прагрэсу і дэмакратыі.

Вяртаючыся зноў і зноў да тых гераічных і трагічных дзён, ацэньваючы падзеі і факты Вялікай Айчыннай вайны, мы не павінны забываць, што фашысцкае нашэсце мела дакладна акрэсленыя мэты і планы. Класавая нянавісць да краіны сацыялізму, захопніцкія імкненні і звярыная сутнасць фашызму зліліся ў адно ў палітыцы, стратэгіі і метадах вядзення вайны.

Савецкі Саюз па планах фашысцкай клікі павінен быў быць падзелены на часткі і ліквідаваны. На яго тэрыторыі меркавалася ўтварыць чатыры рэйхскамісарыяты — германскія правінцыі.

Нацысцкае кіраўніцтва падкрэслівала,што дзейнасць германскай арміі павінна насіць надзвычай жорсткі характар,патрабавала бязлітаснага знішчэння не толькі воінаў Савецкай Арміі, але і грамадзянскага насельніцтва СССР. Салдатам і афіцэрам вермахта былі ўручаны памяткі, у якіх гаварылася: «...забівай кожнага рускага, савецкага, не спыняйся, калі перад табой стары ці жанчына, дзяўчынка ці хлопчык — забівай, гэтым ты выратуеш ад пагібелі сябе, забяспечыш будучыню сваёй сям 'і і праславішся навечна».

Перад пагрозай фашысцкага зняволення савецкі народ праявіў небывалую згуртаванасць і самаадданасць. І гэта нягледзячы на тое, што людзям прышлося перажыць жах сталінскіх рэпрэсій, непамерныя цяжкасці індустрыялізацыі, перагібы калектывізацыі. Абаронцамі Радзімы сталі рабочыя, сяляне, інтэлігенцыя ў салдацкіх шынялях і афіцэрскіх мундзірах. Вайна прыняла агульнанародны характар.

Перамогу кавалі ў поўным сэнсе гэтага слова — на фронце і ў тыле, у партызанскіх атрадах і ў падполлі, у фашысцкіх засценках і на акупіраванай тэрыторыі. У паўгалодных вёсках, якія засталіся без мужчын, увесь цяжар вайны вынеслі на сваіх плячах шматпакутныя сялянкі, савецкія ўдовы, старыя.

Сёння перш за ўсё мы ўспамінаем тых, хто прайшоў дарогамі вайны, набліжаючы светлы дзень вызвалення. Словы ўдзячнасці хочацца выказаць Герою Савецкага Саюза Лебедзеву І. Д., Васільеву П. В., Асокінай Е. В., Самойла Л. О., Атрэшчэнкаву В. І., Будоўскаму Я. І., Ваньшыну В. Ф., Гарбачову І. М., Грыгор 'еву С. А., Казлову В. П., Крыцкаму А. І., Каненкову К. У., Марцірасаву Г. А., Мельнікаву М. А., Курышка Г. Ф., Нікіцевічу В. М. Нізкі паклон былым франтавікам Пракоп 'еву І. І., Сцяпура І. М., Харытонаву А. А., Мінайлаву М. А., Шышко А. М., Далідовічу Я. М., Яроцкаму А. І., Грыцэнка Б. Ф., Патапаву В. М., Чухно В. М. Нашы сэрцы звернуты і да шаноўных жанчын — Кандрацьевай С. В., Сінчылінай В. Т., Заўгародняй Г. Д.

Яны ўжо далёка немаладыя, ветэраны Вялікай Айчыннай: як-ніяк з апошняга пераможнага залпу адлічана сорак шэсць гадоў. Але і цяпер многія плённа працуюць, прымаюць актыўны ўдзел у грамадска-карыснай працы.

Ёсць вялікая справядлівасць у тым, каб аддаць даніну павагі людзям, якія ў час цяжкіх выпрабаванняў не пахіснуліся і паставілі на алтар перамогі сваё жыццё. Давайце памятаць пра тых, што жывуць і працуюць побач з намі, аддаючы свае сілы і зараз нашаму грамадству. У наш такі нялёгкі час.

Вялікай цаной дасталася Перамога. На палях бітваў у Еўропе склалі галовы сотні тысяч савецкіх воінаў. За вызваленне Польшчы загінула 600 тысяч нашых салдат і афіцэраў, Чэхаславакіі — 140 тысяч, Венгрыі — 140 тысяч, Румыніі — каля 69 тысяч, Югаславіі — 8 тысяч, Аўстрыі — 26 тысяч, Нарвегіі — больш як 2 тысячы, Фінляндыі — каля 2 тысяч, Кітая — 8 тысяч, Карэі — 1,5 тысячы. Звыш 100 тысяч воінаў паляглі на зямлі Германіі.

Горка і балюча робіцца на душы, калі даведваешся пра факты вандалізму над помнікамі і магіламі загінуўшых савецкіх салдат у некаторых з гэтых кра ін. Няўжо ж дарэмна было страчана іх жыццё, няўжо ж не заслужылі яны пашаны свайму праху і памяці! Не! Іх памкненні былі чыстымі і высакароднымі, яны неслі свабоду і незалежнасць народам Еўропы. І пра гэта ніхто не мае права забыць.

Будзем жа ўдзячны нашым салдатам і афіцэрам, партызанам і падпольшчыкам, удзельнікам працоўнага фронту. Нашаму гераічнаму народу. Усім тым, хто набліжаў свята Перамогі — адно з самых яскравых і трагічных нашых свят.

Э. ЯРМУСІК,
сакратар парткама, дацэнт кафедры гісторыі БССР.

У адным з мінулых нумароў мы, дарагія чытачы, пазнаёмілі вас з артыкулам І. Піваварчыка «Астрына». Вы даведаліся аб гісторыі ўзнікнення невялікага гарадскога пасёлка, што ў Шчучынскім раёне. Сёння мы працягваем публікацыю даследаванняў І. Піваварчыка.

# АСТРЫНА І ЯЕ ЎЛАДАЛЬНІКІ

Адной з найбольш цікавых і нязведаных старонак гісторыі гарадскога пасёлка Астрына з´яўляецца перыяд з 1451 года, г. зн. з моманту першага ўпамінання аб ім у пісьмовай крыніцы, і да другой паловы 16 стагоддзя.

Менавіта тады ідзе рост і ўмацаванне вялікакняжацкай улады, расшырэнне правоў феадалаў і ўзмацненне запрыгоньвання сялян. На працягу 15 стагоддзя суадносіны зямельнай уласнасці дзяржавы бесперапынна мяняюцца. У дзяржаўныя фонды ўваходзілі тыя землі, якія ў час уключэння заходніх зямель Русі ў склад Вялікага княства Літоўскага не былі захопленыя феадаламі. Яны падзяляліся на дзве часткі: дзяржаўныя землі («валасці») і вялікакняжацкія («двары»), якія належалі непасрэдна Вялікаму князю.

Гістарычныя крыніцы сведчаць аб тым, што і Астрынская воласць з´яўлялася ўладаннем вялікіх князёў Казіміра 4 Ягелончыка (1440-1492), а затым і яго сыноў Аляксандра (1492-1506) і Жыгімонта І Старога (1506-1548). Для кіравання сваімі зямельнымі ўладаннямі вялікі князь назначае намеснікаў. Імі сталі прадстаўнікі Вялікага князя, якія валодалі адміністрацыйна-гаспадарчай, фінансавай і судзебнай уладай на месцах.

У 1501 годзе намеснікам астрынскім быў Глеб Пронскі. Выконваў ён абавязкі прыкладна да 1508 года, а вось з 1508 і, верагодна, да 1510 года намеснікам астрынскім быў Федко Хрэптовіч. Пад яго наглядам знаходзіліся грошы і каштоўнасці, атрыбуты вялікакняжацкай і дзяржаўнай улады.

На змену Хрэптовічу намеснікам астрынскім назначаецца Станіслаў Скіндзер.

У 1520 годзе Астрына перастае быць уласнасцю Вялікага князя і пераходзіць у рукі аднаго з буйных феадалаў Вялікага княства Літоўскага — Аляксандра Іванавіча Хадкевіча. Гэта стала магчымым таму, што кароль, «задолжав Александру Ходкевичу 500 копе грошей, отдал ему двор свой Троцкого повету Острину до выбранья суммы его на три года, а потом до его живота». Які быў новы ўладальнік?

Прозвішча Хадкевічаў утварылася ад Ходка, што азначае ў скарочаным вымаўленні Ходар або Фёдар. Роданачальнікам Хадкевічаў лічыцца Ходка Юр´евіч, вядомы з 1436 года. Сын Ходка Іван у 1470 годзе быў каралеўскім маршалкам, у 1476 — віцебскім намеснікам, а ў 1482 — кіеўскім ваеводай. У час нашэсця татараў на Кіеў ён трапіў у палон і памёр у няволі. Сынам ваяводы і быў Аляксандр Іванавіч Хадкевіч. На працягу амаль 50 гадоў (з 1501 па 1549 г.) Аляксандр Хадкевіч займаў шэраг важных пасад у дзяржаве (староста брэсцкі, ваявода навагрудскі, маршалак Вялікага княства Літоўскага). Ён меў чатырох сыноў — Івана, Іероніма, Рыгора і Юрыя. Старэйшы — Іван — рана памёр, а вось астатнія сыны, як і іх бацька, займалі важныя дзяржаўныя пасады. Іеронім з 1538 па 1561 год прайшоў шлях ад ашмянскага да віленскага каштэляна. Рыгор быў адным з самых вядомых членаў сям´і Хадкевічаў. У Рыгора, які быў жанаты на княжне Вішнявецкай, было два сыны і дзве дачкі, адна з іх — Соф´я — была жонкай Філона Кміты, старасты аршанскага і памінальнага ваяводы смаленскага, які пакінуў цікавыя літаратурныя помнікі пісьменнасці.

Сам Рыгор Хадкевіч ужо з 1566 года вядомы як вялікі гетман Вялікага княства Літоўскага. Самы малодшы з сыноў Аляксандра — Юрый — два разы быў паслом ВкЛ у Маскву, другі раз ён быў жанаты на дачцэ князя Юрыя Слуцкага. З 1554 года ён вядомы як стольнік ашмянскі, а з 1566 года — як каштэлян троцкі.

Аляксандр Іванавіч Хадкевіч займаўся мецэнацкай дзейнасцю. Ім быў заснаваны Супрасльскі манастыр, які пачалі будаваць у 1498 годзе ў мясцовасці, якая называлася «Грудок», але ў 1500 годзе яго, са згоды заснавальніка, перанеслі на другое, больш зручнае месца на рацэ Супраслі. У 1503 годзе ў манастыры ўжо на новым месцы пачалі будаваць каменную цэркву-крэпасць Благавяшчэння, якая стала галоўнай архітэктурнай славутасцю манастыра. У самым пачатку існавання манастыра грашовыя сродкі для яго вылучыў А. І. Хадкевіч, ён жа забяспечыў лесам для будоўлі, даўшы надзел у пушчы. Да сярэдзіны 16 стагодзя ў манастыры знаходзіўся збор раскошнай царкоўнай вопраткі, вялікая колькасць ікон, упрыгожаных каштоўнымі камнямі, каля 208 тамоў кніг, часткова пергаментных, у дарагіх перaплётах. У набыцці ўсяго гэтага вялікую дапамогу аказаў А. І. Хадкевіч. Ён набыў для манастыра больш, чым сто рукапісных кніг. З гэтым гарадскім пасёлкам цесна звязаны імёны не толькі Хадкевічаў, але і іншых вядомых магнацкіх радоў — Сапег, Пацоў, татарскага царэвіча Астрынскага. Пра іх вы даведаецеся пазней у адным з будучых нумароў газеты.

І. Піваварчык,
студэнт 2 курса гістфака.




## ГАБРАЎСКІЯ АНЕКДОТЫ

Вырашыў дзед Міню Поп падараваць габраўскаму дому-чытальні сорак тысяч леваў. Прыйшоў ў банк аформіць перавод грошай, і калі ў яго там запатрабавалі два левы на гербавую марку, сказаў:

— У каго ёсць на гэта грошы, той няхай і дае! А ў мяне на фармальнасці грошай няма!

★ ★ ★

Габравец спыніўся ў таннай гасцініцы. Уначы яго адолелі клапы. Ён устаў, запаліў святло, адкрыў дзверы, потым моцна закрыў іх і зноў лёг. Сусед па нумару здзіўлена паглядзеў на габраўца, а той сказаў:

— Падманваю клапоў. Няхай думаюць, што я пайшоў.

★ ★ ★

— Колькі каштуе білет у ванну?

— Два левы.

— Вось вам адзін леў, наліце ванну да палавіны.

★ ★ ★

Надумаўся габравец паставіць надгроб´е сваёй цёшчы.

— Ці ёсць у вас што-небудзь саліднае, але таннае? — спытаў ён у пахавальным бюро.

— Ёсць адна пліта, толькі на ёй высечана іншае імя.

— Нічога, я бяру. Мая цёшча не ўмела чытаць.

★ ★ ★

У гандляра не знайшлося стоцінкі для таго, каб даць рэшту.

— Што ж мне вам даць узамен? — спытаў ён пакупніка.

— Не будзем дробязнымі! — адказаў пакупнік і адразу дадаў: — Наліце мне шклянку гарэлкі, і справе канец!

## ЗАПАВЕТЫ КАНФУЦЫЯ

**Сур´ёзную спробу глыбокага асэнсавання выхавання зрабіў дзяржаўны дзеяч і педагог Старажытнага Кітая Канфуцый (каля 551 —479 гг. да н.э.). Гарантыяй выканання чалавекам сваіх абавязкаў ён лічыў правільнае выхаванне, клопат аб якім ставіў у дзейнасці кіраўніка дзяржавы ў адзін рад з забеспячэннем людзей матэрыяльнымі сродкамі для існавання.**

**Прыродныя якасці людзей Канфуцый разглядаў як такі матэрыял, з якога пры правільным выхаванні можна сфарміраваць ідэальнага чалавека. Ён не лічыў выхаванне ўсемагутным і звязваў яго са здольнасцямі людзей і іх працалюбствам.**

**Канфуцый сцвярджаў, што магчымасці людзей у справе разумення ісціны, мудрасці розныя, і ў суадноснасці з гэтымі магчымасцямі праводзіў дзеянне ў грамадстве. Старажытнакітайскі мудрэц выдзяляў сыноў неба (кіраўнікоў), якія валодалі вышэйшай мудрасцю з нараджэння; высакародных мужоў (апору дзяржавы), якія атрымлівалі веды дзякуючы вучэнню; тых, хто вучыцца, нягледзячы на цяжкасці; прасталюдзінаў, якія, напаткаўшы цяжкасці, не вучацца ці не здольныя да таго, каб набыць сабе веды.**

**У высакародных мужах Канфуцый бачыў ідэал дасканалага чалавека, вобраз якога павінен быў, на яго думку, вызначыць мэту выхавання. Высакародны муж прытрымліваецца ісціны. Ён павінен валодаць высокімі маральнымі якасцямі — чалавекалюбствам, дабрынёй, праўдзівасцю і г.д., а таксама высокай духоўнай культурай. Звяртаючы ўвагу на тое, што адукаванасць непадзельна існуе з маральнасцю, Канфуцый ставіў мараль на першае месца.**

**Ідэал высакароднага мужа, які быў арыенцірам для Канфуцыя, вызначаючы мэту выхавання, разам з высокай маральнасцю і адукаванасцю, уключаў у сябе таксама і іншыя кампаненты ўсебакова развітай асобы. «Накіруй сваю волю на дасягненне правільнага шляху, — вучыў Канфуцый, — прытрымлівайся прынцыпаў маралі. Паступай у суадноснасці з чалавекалюбствам, практыкуйся ў мастацтвах». Пад імі ён разумеў традыцыйныя для кітайскага выхавання «шэсць мастацтваў» — цэрыманіял, музыку, стральбу з лука, кіраванне калясніцай, чытанне і матэматыку.**

**Вялікую ўвагу Канфуцый надаваў разумоваму развіццю. «Вучыцца і не задумвацца — дарма губіць час, задумвацца і не вучыцца — згубна», — казаў ён, гаворачы ў той жа час аб небяспечнасці адарваных ад жыцця меркаванняў, не звязаных з канкрэтнымі ведамі. Узмацняючы гэтую ідэю, ён падкрэсліваў: «Я цэлыя дні не ем і не сплю, усё думаю. Але ад гэтага няма карысці. Лепш вучыцца».**

**Прад´яўляючы высокія патрабаванні да выхавацеля, Канфуцый лічыў, што ім можа быць толькі той чалавек, які паспяхова ўдасканальвае сябе. Ён патрабаваў ад настаўнікаў вучыць толькі тых, хто імкнецца да дасягнення ведаў, дапамагаць тым, хто адчувае цяжкасці пры выражэнні сваіх думак. Канфуцый настойваў на неабходнасці індывідуальнага падыходу да вучняў, указваў, што ёсць людзі, якім настаўленні ўжо не патрэбны з-за таго, што яны дасягнулі пэўнага ўзроўню, а ёсць людзі, якіх вучыць наогул не трэба, бо ў іх адсутнічае імкненне да ведаў ці неабходныя здольнасці.**

**Вучэнне Канфуцыя, якое стала ў канцы ІІ ст. да н.э. афіцыйнай ідэалогіяй Кітайскай імперыі, вызначыла больш чым на два тысячагоддзі характар выхавання і адукацыі ў дзяржаве. Старажытнакітайскі мысліцель быў абвешчаны найвялікшым з мудрацоў, апекуном школы і вучоных, «настаўнікам 10 тысяч пакаленняў», нацыянальным героем. У Кітаі распаўсюджаны культ Канфуцыя, які стаў самым паважаным святым.**

**Г. КАРНЕТАЎ,**
**кандыдат педагагічных навук.**



Наш адрас:
230023, г. Гродна,
вул. Ажэшкі, 22, пакой 404,
тэл. 44-72-97

Газета выходзіць штотыднёва
Аб´ём газеты — адзін друкаваны аркуш

Газета надрукавана афсетным спосабам у Гродзенскай абласной узбуйненай друкарні г. Гродна, вул. Паліграфістаў, 4
Падпісана ў друк у 16.00.
т.2000 Зак. 3123

ЗАСНАВАЛЬНІКІ:
САВЕТ УНІВЕРСІТЭТА,
ПРАФКАМ СУПРАЦОЎНІКАЎ,
ПАРТКАМ, ПРАФКАМ
СТУДЭНТАЎ,
КАМІТЭТ КАМСАМОЛА.

С. М. ЛАЎНІК